«еретиками» [6, с. 114]. Однако, рассматривая проблему в её эскалации, мы обнаруживаем, что это противостояние не находилось только лишь в русле спора о владении землями язычников. Русские представлялись наподобие «завистливых Ефремлян», блудных братьев, которых необходимо вернуть в лоно «одной» матери [7] – римской церкви. В силу того, что «верные сыновья» - латиняне обладают большим правом на священство, атрибуты сакрального должны находится у них, как свидетельства благосклонного Провидения. Интерпретируя таким образом проблему реликвий, мы можем рассматривать эволюцию отношений русских и латинян в русле известных нам категорий восприятия последних.

**Вывод**. Мы можем заключить, что духовенство являлось активным участником происходящего: оно не творило действительность, а отображало её в своих нарративах, т.к. слова, посеянные им в умах пилигримов, в течении времени воплощались в их действиях. В этом отношении средневековое общество аскетов может восприниматься нами как ещё более интегрированное и сложное в силу своей взаимосвязующей мысли, чем это могло казаться раньше.

### Литература


1. *Фоссье Р.* Люди средневековья. Спб., 2010.
2. *Пикки Р.* Функция библейского тематического ключа // Slavia orthodoxa : Литература и язык : Сб. науч. тр. : М., 2003.
3. Генрих Латвийский. Хроника Ливонии. Л.; М., 1938.
4. Петр из Дусбурга. Хроника земли прусской. М., 1997.
5. *Riley-Smith J.* Early Crusades to the East and the Costs of Crusading, 1095-1130 // The crusades : The essential reading / Ed.: Thomas F.Madden. Oxford : Blackwell, 2002. (Blackwell essential readings in history).
6. *Флоря Б. Н.* У истоков религиозного раскола славянского мира. XIII век. Спб., 2004.
7. Innocenrii P. III. Litterae Archiepiscopis et universis tam clericis quam laicis per Rutheniam constitutis // Акты исторические, относящиеся к России, извлечённые из иностранных архивов и библиотек. Т1, д. ст. сов. А. И. Тургеневым. Санкт-Петербург: в Типографии Э. Праца, 1841.


# ЗЛАЧЫННАСЦЬ І ДЭВІАНТНЫЯ ПАВОДЗІНЫ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.


## Н. А. Самаль


На працягу ўсёй гісторыі жыццё чалавека суправаджалася парушэннем пэўных агульнапрынятых нормаў, выпрацаваных і ўсталяваных або людзьмі і часам, або дзяржавай. Прававая свядомасць большасці насельніцтва, не цалкам адпавядала тагачаснаму заканадаўству, што таксама выклікала павелічэнне агульнай колькасці

злачынстваў, з пункту гледжання закона, але магло абсалютна суадносіцца з агульнапрынятымі нормамі жыцця. «У шматлікіх месцах мелкі крадзеж, асабліва лесу, або пладоў з поля, не лічылася злачынствам» [2, с. 69].

Змены як на агульнадзяржаўным, так і на мясцовым узроўні, заўсёды пакідаюць адбітак на паводзінах насельніцтва. «Адразу пасля адмены прыгоннага права ў сялян выявілася пачуцце павагі да сваёй асобы, пачуцце незалежнасці, індывідуалізму, асабліва прыкметнае ў абшчынах, якія мелі сувязі з горадам дзякуючы адыходнікам. Гэта выявілася ў падзенні маральнасці, дысцыпліны, замаху на ўласнасць абшчыны, непавазе да бацькоў, росце п’янства, зніжэнні павагі да царквы і рэлігіі» [1, с. 335]. Пранікненню новых ідэй у веску, асабліва юрыдычнага характару, перашкаджаў нізкі ўзровень адукаванасці насельнітва, дзенідзе нават захаванне язычніцкіх верванняў. Да 1870-х гг. у некаторых месцах, напрыклад у Мінскай губерніі, здараліся выпадкі чалавечых ахвярапрынашэнняў падчас эпідэміі халеры. Практыкавалася разрыванне могілак, для атрымання абярэгу, дзякуючы якім імкнуліся захаваць пасевы ад засухі. Як сцвярджае Б.Н. Міронаў, сяляне кралі пэўныя рэчы, бо спадзяваліся, што яны прынясуць ў іх хату згоду [2, с. 76]. Пры гэтым факты разрабавання могілак сустракаюцца і ў больш позніх крыніцах. Напрыклад, у «Аглядзе Магілёўскай губерніі», як і ў аналагічных крыніцах па іншых губерніях, прыводзяцца звесткі аб колькасці тых ці іншых злачынстваў сярод насельніцтва. Так, даецца наступная інфармацыя «Блюзнерства, разрыцце могілак і рабаванне мертвых целаў: 8 асуджаных на 1881 г.» [14, с. 19].

1860-я гг. сталі пераломным момантам як для простага, так і для больш знатнага насельніцва. На падставе статыстычных дадзеных можна казаць аб значным росце колькасці спраў па разгляду пазямельных спрэчак паміж сялянамі, арандатарамі і памешчыкамі. Змяняецца аб’ект злачынства: месца грамадскага і дзяржаўнага парадку займаюць прыватныя асобы, а менавіта іх уласнасць, памешчык паўстае як пакрыўджаны бок. Як прыклад, можна прывесці справу «паміж яўрэямі і уладаром мястэчка Чарнецкім з нагоды неаплаты першымі чыншу за зямлю, занятую і прысвоеную ім ва уласнасць » [3, с. 4].

Вядома, што на тэрыторыі беларускіх губерняў, якія ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі было значна распаўсюджана вінакурэнне. У выніку чаго, асобная частка злачынстваў і распаўсюджванне п’янства было звязана менавіта з гэтым. Характэрна, што п’янства можа разглядацца як асобная форма дэвіянтных паводзін і фактар росту злачыннасці. Цікава, што аналізуючы судовыя справы, якія тычыліся яўрэйскага насельніцтва можна зрабіць высновы аб маральным стане непасрэдна

беларускіх сялян. Дадзены факт можна прасачыць у справе аб супрацьзаконным продажы віна яўрэйкай Ландонавай, якая была ўзбуджана па заяве старшыні Марцінаўскай абшчыны. Гэта сведчыць аб тым, што сялянская абшчына, якая захоўвалася ва ўсходніх губерніях, Магілёўскай і Віцебскай, была стрымліваючым фактарам у развіцці злачыннасці. У справе Ландонавай, апошнюю абвінавачвалі ў тым, што яна «абыходзячы вёску збірае нейкую даніну з сялян, частуе іх водкаю, патрабуючы за гэта вырабаў сельскай гаспадаркі: бульбу авёс, пакупу, крупу і нават сялянскія бліны» [4, с. 24]. Зыходзячы са звестак, прыведзеных у справе, становіцца зразумелым, што гэта быў не адзінкавы выпадак. У народзе гэта справа нават атрымала сваю назву – «Каляда». «Нярэка здаралася, што пачаставаўшы селяніна водкаю, атрымліваеш за гэта у тры, або ў чатыры разы вышэйшую плату разнастайнымі прыпасамі, а калі-нікалі застаўшы адну хазяйку у хаце, падпаіўшы якую, нестрымліваішся ў сваіх дзеяннях. Словам казаць, калі апісваць усе дзеянні яўрэяў, то можна скласці дастаткова цікавы раман» [4, с. 24]. З гэтага можна зрабіць выснову як аб тым, што сярод вясковага насельніцтва было распаўсюджана злоўжыванне алкагольнымі напоямі, так і аб тым, што становішча яўрэйскага насельніцтва было дастаткова складаным, калі яны ездзілі па вёсках і збіралі прадукты харчавання. У сваю чаргу, відавочна, сярод яўрэйскага насельніцтва быў распаўсюджаны продаж і незаконны выраб гарэлкі. Па данясенні аб тым, што адзін чалавек у Віцебскай губерніі вырабляе бязпошлінна гарэлку на продаж, чыноўнікі акцызнага ведамства наведаліся да гэтага яўрэя. Пад час агляду дому, яны пачулі на вуліцы крык «аддайце мне маю гарэлку, я за яе сплаціў грошы» [10, с. 6]. Гэта быў селянін з суседняй вескі, зразумела, не ў цвярозым стане.

Для больш позняга часу характэрна пашырэнне колькасці правапарушэнняў, якія ў статыстычных дадзеных адносяцца да злачынстваў супраць веры, але на агульным фоне нельга казаць аб значным падзенні рэлігійнасці насельніцтва, асабліва сялянскага. Напрыклад, у Мінскіх губернскіх ведамасцях прыводзіліся наступныя звесткі: « 26 мая з Сервечска-Любанінскай царквы выкрадзена скрыня з грашыма звыш 80 руб. У здзяйсненні гэтага падазроным аказаўся селянін Міахаіл Цыунчык» [18, с. 5]. Але ж патрэбна ўлічваць і тое, што у асобных выпадках сяляне былі не суб’ектам, а аб’ектам злачынстваў, у насельніцтва яшчэ захоўвалася непавага да селяніна. Дадзены факт адлюстраваны у скарзе на святарку Ігнацьеву. «Пад час пражывання яе ў мяне з-за скаладанага становішча я адмовіў ей у далейшым кватэраванні, затым Ігнацьева, злобствуя на мяне пачала паўсюль ганьбіць мяне і гонар маёй сям’і, на годнасць і гонар старасты» [7, с. 2]. Сяляне ста-

навіліся аб’ектам збіцця. «Пад час абеду прыбыў да дому стараста Марцін Сідараў, але па невядомай справе, пасля чаго адразу пачаў збіваць мойго мужа і патрабаваць ад яго грошай» [12, с. 4].

Найбольш распаўсюджаным відам злачынства, увогуле сярод насельніцтва, быў крадзеж і забойства. На тэрыторыі Беларусі большасць спраў па крадзежам была зафіксавана ў Віцебскай акрузе, мінімум асуджаных за крадзежы было на тэрыторыі Гродзенскай акругі. Але адносна тэрыторыі Расійскай імперыі «вельмі невысокая наклоннасць да ўмыснага крадзежу маёмасці ўвогуле на тэрыторыі Беларусі» [19, с. 135]. Злачынствы супраць маральнасці таксама мелі месца у грамацтве, звесткі пра якія можна знайсці нават у тагачасных часопісах. «Згвалтаванне. Ігуменскі павет, на пачатку лістапада, селянін Іван Мастовіч – 14 гадоў, згвалтаваў 7-гадовую мяшчанскую дзяўчынку Францішку Макарэвіч» [18, с. 5]. Былі і гумарыстычныя справы, якія даюць уяўленне аб умовах жыцця насельніцтва. Справа сяляніна аб вяртанні яму грошай за падрыхтоўку да вяселля, якое было сарвана па віне нявесты, бо праз некаторы час апошняя вырашыла выйсці замуж за іншага «дзяўчына, якая параілася з братам і маці адмовіла мне. Ввярніце мне страты, панесеныя на частаванні» [9, с. 2].

Для гарадскога насельніцтва характэрна значна больш шырокае кола злачынстваў. «У кватэры аднаго яўрэя ў г. Магілеў была выкрыта вытворчасць фальшывых манет і паштовак» [14, с. 19]. Да др. пал. XIX ст. характэрна павелічэнне колькасці жаночых злачынстваў, безумоўна яны мелі сваеасабовую накіраванасць. Большая колькосць злачынстваў тычыліся менавіта дзетазабойства. Пры даследванні архіўных матэрыялаў, часопісаў трапляецца шмат звестак аб выпадковым знаходжанні народжаных дзяцей уздож берагоў рэк і каля дарог. «Яўрэі разам з мешчанінам з горада Віцебска у вёску насілі гарэлку, каля дарогі недалека ад горада знайшлі дзецкае цела» [8, с. 20]. Цікавая статыстыка назіраецца і ў горадзе Мінску на 1883 г. калі палова дзетазабойстваў па ўсёй губерніі прыпадае на гарадское насельніцтва. Распаўсюджанай з’явай было самазабойства. «Уладар карчмы, віцебскі мешчанін Якаў Карнеў, ад нараджэння 40 гадоў..а поўдня увайшоўшы ў хлеў, які знаходзіўся пры карчме, павесіўся» [8, с. 36].

На падставе аналізу судовых спраў і перыядычнага друку, можна казаць аб тым, што адразу пасля рэформы 1861 г. сярод вясковага насельніцтва назіраіцца значны рост маёмасных спрэчак, распаўсюджаны такія злачынствы, як падпал, крадзеж, пабоі, злачынствы супраць веры. Большую цікавасць прадстаўляе факт распаўсюджанасці злоўжывання спіртнымі напоямі, дзета- і самазабойстваў. Сярод агульнай колькасці судовых спраў яны складаюць значны адсотак. Можна

канстатаваць той факт, што адносна тэрыторыі Расійскай імперыі, у беларускіх губернях не адзначаецца шырокае распаўсюджанне злачыннасці, можна казаць цыклічнасці характару злачыннасці.

**Літаратура**


1. *Миронов Б. Н.* Социальная история России периода империи (XVIII – нач. XX в.) Т1. СПб., 2003.
2. *Миронов Б. Н.* Социальная история России периода империи (XVIII – нач. XX в.) Т2. СПб., 2003.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 146. Воп.2. Адз.зах. 3138. Дело о взаимных денежных претензиях мещан М. Любенеев Пинского уезда и владельца местечка помещика А. Чарнецкого.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 2500. Воп.1. Адз.зах.616. Дело о противозаконной продаже вина еврейкой Лондоовой 1869 г.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 2500. Воп.1. Адз.зах.764. Дело о нанесении оскорбления священницою Преподобной Королевицкой церкви Анастасьи Игнатьевой крестьянину Королевицкой обл. Феодосу Малахову.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 2500. Воп.1. Адз.зах.404. Донесения Военному начальник Витебского уезда.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 2500. Воп.1. Адз.зах.715. Дело по жалобе крестьянина деревни Слабодки Гаврилова об взыскании в его пользу расходов по подготовке к свадьбе.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 2500. Воп.1. Адз.зах.680. Дело о злоўпотреблении чиновниками акцизного ведомства по выделке и продаже питейств.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 2500. Воп.1. Адз.зах.530. Дело о нанесении побоев крестьянину Федору Григорьеву, Мартиным Сидоровичем.
10. Обзор Могилёвской губернии за 1881 г. Приложение ко всеподданнейшему отчёту могилевского губернатора. Могилёв: Типография губернского правления, 1881 г. С. 34, 54.
11. О происшествиях в минской губернии // Минские губернские ведомости. Неофициальная часть. 1884, 27 июля. С. 5.
12. *Тарновский Е. Н.* Итоги русской уголовной статистики за 20 лет. (1874–1894 гг.). СПб., 1899.


## ГОСУДАРСТВЕННАЯ ДУМА РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ. АНАЛИЗ ПРОСОПОГРАФИЧЕСКИХ ДАННЫХ


**Е. С. Семенова**


Демократические преобразования в странах, не имеющих большого опыта развития институтов парламентаризма, требуют использования готовых моделей формирования политических органов власти. Одной из таких моделей может служить опыт становления системы парламентаризма в Российской Империи (РИ).